# У СКАРБОНКУ РОДНАГА СЛОВА

*З. І. Бадзевіч, В. П. Трайкоўская (Мінск)*

## МАРФАЛАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ЛАГОЙШЧЫНЫ

Гаворкі Лагойскага раёна адносяцца да сярэднебеларускіх гаворак Беларусі і складаюць аснову сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Яны адыгралі значную ролю ў творчым лёсе такіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, як Змітрок Бядуля, Ніл Гілевіч, Мікола Гіль, Іван Пташнікаў і інш. На Лагойшчыне ўзрасцілася светлая і бунтоўная паэзія Янкі Купалы. Вядомы народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч найбольш поўна пераняў і з вялікім плёнам выкарыстаў багацце і шматфарбнасць мовы і фальклору гэтага краю. Дзякуючы яго вершам, паэмам шмат якія словы, фразеалагічныя адзінкі і сінтаксічныя канструкцыі, што ўжываюцца ў гаворцы землякоў паэта, патрапілі ў літаратурную мову і разнастайныя слоўнікі беларускай мовы.

Асаблівасці гаворак Лагойшчыны адзначаюцца найперш у граматыцы (марфалагічнай структуры, у канчатках слоў, у будове асноў і сінтаксічных канструкцый і інш.). Спынімся на асобных марфалагічных асаблівасцях дадзеных гаворак.

Род некаторых назоўнікаў можа не супадаць з родам іх адпаведнікаў у беларускай літаратурнай мове. Так, назоўнікі *грыпа, бінзіна, санаторыя, пасага, карасіна, бланка, піяніна, радзіва* – жаночага роду: *Дзеці на грыпу хварэлі.* (Звярынічы); *Раней за пасагу бралі.* (Гайна); *Толькі вечарам загаварыла радзіва.* (Корань) Назоўнікі тыпу *сабака, боль, пуць, пыл, палын* маюць форму як мужчынскага роду (супадаюць з літаратурнай мовай), так і жаночага: *У Данілы злосная сабака.* (Звярынічы); *Маленькі сабачка, але звяглівы.* (Бясяды); *Усё пакрылася пыллю.* (Рудня) і *Тарфяны пыл у нас лётае і зімой, і летам, бурты гараць, а вецер разнося.* (Звярынічы)

Захаваліся ў лагойскіх гаворках, як і ў літаратурнай мове, формы давальнага-творнага склону парнага ліку: *дзвярыма, вачыма, плячыма.* Паралельна ўжываюцца назоўнікі *дзвярамі, плячамі, вачамі.*

Пры скланенні назоўнікаў у большасці склонавых форм канчаткі адпавядаюць літаратурнай норме. Канчатак *-ы (-і)* ў назоўным склоне множнага ліку назіраецца ў большасці назоўнікаў: *дровы, палотны, гнёзды, вокны, хусткі, каровы, авечкі, ватоўкі.* Аднак формы назоўнікаў мужчынскага роду (зрэдку ніякага) множнага ліку ў давальным і месным склонах могуць мець канчаткі *-ом (-ём), -ох (-ёх)*: *Паехалі к братом, дай паесці катом.* (Глебаўшчына); *Я цяпер дзяцём расказваю.* (Ізбішча); у *Шашкох была, як Дальву палілі.* (Глебаўшчына); *На лугох процьма казлоў.* (Прудкі)



Аднаскладовы канчатак *-ой (-ай)*, як і ў літаратурнай мове, назіраецца ў назоўнікаў адзіночнага ліку: *Вадой налівацъ бульбу трэба не даверху.* (Слабада); *Пойдзім сахой пахаць.* (Засцепак); *Трошкі прысыпаў зямлёй.* (Гайна)

У адрозненне ад літаратурнай мовы, канчатак *-я* адзначаецца ў некаторых назоўнікаў давальнага і меснага склонаў адзіночнага ліку: *Зімой сядзім у хаця.* (Ізбішча); *У ступя таўклі разам з здорам.* (Ізбішча); *На машыня на работу адвязуць і прывязуць дамоў.* (Малінаўка)

Форма на *-ы (-і)* ўжываецца ў вінавальным склоне адушаўлёных назоўнікаў: у *вайну пакінулі каровы, авечкі, хавалі ў лесе.* (Глебаўшчына).

Назоўнікі, што абазначаюць маладых істот, заканчваюцца на *-о, -а*: *важаня, свінчо, дзіця (дзіцё), гусянё, ягнё і інш.*: *Калі карова ацялілася ў нядзелю, то цялё завецца Красуляй.* (Завішына); *Важаня ў нас пат хатай цэлую восінь жыло.* (Рудня)

Назоўнік жаночага роду *мыш* у гаворцы вёскі Бяларучы мае форму *мыша* ў назоўным склоне: *Ай, мыша во! Ды ні дзяржы ты яе ў руках.* (Бяларучы)

Сярод прыметнікаў пераважаюць поўныя формы: *груцаная (каша), сырая ( бяроза), бяссільная (маці), старая (баба), чыстая, крынічная (вада) і інш.* Аднак у зваротах, якія набылі пэўную ўстойлівасць, ужываюцца звычайна кароткія якасныя прыметнікі: *здароў будзім, гол як сокал, повен падпечак белых авечак.*

Як і ў літаратурнай мове, пашыраным з'яўляецца канчатак якасных прыметнікаў, неасабовых займеннікаў, парадкавых лічэбнікаў жаночага роду *-ую (-юю)* ў вінавальным склоне адзіночнага ліку: *гэную карову, сінюю ленту, белую лялею, прыгожую дзяўчыну, другую яблыню.* Тым не менш побач можа ўжывацца канчатак *-аю (-яю): новаю хату, сіняю ленту, белаю кофту, усякаю работу.* (Знаменка)

Прыметнікі, неасабовыя займеннікі і парадкавыя лічэбнікі жаночага роду адзіночнага ліку ў большасці гаворак Лагойшчыны, як і ў літаратурнай мове, маюць пад націскам форму меснага склону на *-ой (-ёй)*: у *старой, на сваёй, с анной, на другой* і інш., а не пад націскам вымаўляецца канчатак *-ай (-яй)*: *у габляванай, у лакавай, на дзівятай, на гэтай* і інш.

Для жывой гутарковай мовы Лагойшчыны характэрна ўжыванне ўказальных займеннікаў, якія супадаюць з літаратурнымі формамі: *гэты, гэтага, гэта* і адрозніваюцца ад іх (*гэны, гэткі, эта, ета*). *Ад гэтай дзярэўні Знаменкі бліска.* (Знаменка); *Не, нашто ты гэтага малога мягнуў.* (Тхарніца); *Яны пад гэнай газулічкай слепяцца.* (Бяларучы); *А ў нас двор о гэткі вялікі.* (Пячное); *Хутарамі мы жылі , эта кілометра два адгэтуль.* (Знаменка); *у ету нядзелю ў мае нявесткі бабленне будзе.* (Рудня)

Да спецыфічных моўных рыс Лагойшчыны належыць ужыванне форм дзеясловаў II спражэння 3-яй асобы адзіночнага ліку без *-ць*: *нагавора, не бача, робя, кормя, кура, выступя, як хваця, купя* і інш. Форма 3-яй асобы адзіночнага ліку дзеясловаў І спражэння

вымаўляецца без *-ць: нясе, расце, пасе, вылязя, пакаштуя*. Аднак пад уплывам гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту ў гаворкі Лагойшчыны пранікаюць дзеяслоўныя формы на *-ць: расцець бульба, намнець лёну* (Бясяды); *возьмець вядро, паўзець па полі* (Малінаўка); *дык нас рвець як катоў.* (Ізбішча) Дзеясловы I і II спражэнняў у 2-ой асобе множнага ліку вымаўляюцца паўсямесна з націскным канцовым *-о: маўчыцё, сядзіцё, бярыцё, відзіцё, ляжыцё і інш.*

Назіраюцца дублетныя формы дзеясловаў на *-уць (-юць), -аць (-яць): круцюць і круцяць, клеюць і клеяць, гаворуць і гавораць, носюць і носяць, паробюць і паробяць.*

Пасля прыставак *па-, пры-, на-, вы-* ў асабовых формах дзеясловаў пачатковае *й* (з *і*) кораня не захоўваецца*: Тады пашлі на вуліцу с танцамі.* (Мяхеды); *Прышла замуш у хутар Лушкі.* (Знаменка); *Нашоў сабе горку.* (Малінаўка); *Вышла залівання добра.* (Задор'е)

Дзеепрыслоўі ўжываюцца часцей з суфіксам *-ічы: просічы, стоічы, седзічы, носічы.*

Дзеепрыслоўі прошлага часу закончанага трывання ўжываюцца з суфіксамі *-ўшы, -шы: і яшчэ ш Змітры майго прыехаўшы ні было.* (Пячное); *Там у нас быў астаўшыся сын.* (Бяларучы)

У мове жыхароў Лагойшчыны адзначаюцца прыслоўі, вядомыя беларускай літаратурнай мове, як пісьмовай, так і вуснай формам: *вельмі, зверху, сёлета, сюды, неяк, пакуль, натта, многа, гэтулькі (разм.), з гэтуль (разм.), тамака (разм.)* і інш. Разам з тым, ужываюцца прыслоўі, што адрозніваюцца ад агульнаўжывальных форм асобнымі гукамі ці словаўтваральнымі сродкамі*: усядно «усё роўна», гэдак «так», сюдою «у гэты бок», саўсім «назаўсёды», тожы «таксама», шчэ «яшчэ».*

У гэтых гаворках выкарыстоўваюцца невядомыя літаратурнай мове прыназоўнікі *із* і *іс* (літаратурная норма *з, са*): *Маслінка ідзець па сяле із блінамі.* (Мяхеды); *Па сяле вязуць іс песнямі.* (Мяхеды)

Пашыраны прыназоўнік *к*, які можа выражаць прасторавае значэнне: *Ставілі хату на свет дзвярыма к сонцу.* (Знаменка); або ўказваць на ступень, якой дасягае дзеянне: *Цягне к сабе той, а той к сабе.* (Мяхеды); у некаторых гаворках ужываецца прыназоўнік *кала*, які адпавядае літаратурнай норме *каля: Абыду кругом, пагляжу кала таго, кала гэтага, стыдна мне.* (Малінаўка); *Кала капца цупікаў набяром і пячом бліны.* (Дзяніскі)

Гаворкам Лагойшчыны ўласцівы састаўны злучнік *патаму што*: *Патаму што як дваццаць год міне, дык тады кажны гот яблыкі ёсць на яблыні.* (Знаменка)*; Пасля вайны жылі вельмі бедна, патаму што ўсё ў вайну спалілі.* (Малінаўка) Гаворцы жыхароў вёскі Акцябр вядома ўжыванне супраціўнага злучніка *алі*, побач з літаратурным *але*: *Алі відаць гэдак ужо цяшка ёй патом.* (Акцябр)

Часціца *дык* у адной і той жа гаворцы можа мець варыянтную форму *дак: А мама аддасць гэтыя абрэскі, дык мы пасушым.* (Ізбішча); *Дак я й цяпер дзіцём успамінаю.* (Ізбішча), а часціца *бы* ў асобных гаворках – *ба*: *Хоць ба яны рас глянали на поле, як арэцца, сеіцца.* (Засценак)



У некаторых гаворках ужываецца часціца *аш* (літаратурная норма *аж*): *Аш крычаць людзі, енчуць. Аш у Шашкох крык і плач.* (Глебаўшчына); *Людзей аш чорна ў лесі.* (Бяларучы)

Народныя гаворкі Лагойшчыны з'яўляюцца арганічнай часткай мовы беларускага народа і абслугоўваюць патрэбы штодзённых зносін лагайчан.

*В. Я. Барысенка (Мазыр)*

## ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ГРУПЫ ДЗЕЯСЛОЎНЫХ МЕТАФАР У ПАЭЗІІ ВАСІЛЯ ВІТКІ

У аснове дзеяслоўных метафар ляжыць апісанне аб'ектыўных з'яў і працэсаў, характарыстыка канкрэтных рэалій. Васіль Вітка для дакладнасці і вобразнасці перадачы дзеяння, каб падкрэсліць драматызм абставін, выкарыстоўвае прыём ампліфікацыі сінанімічных дзеясловаў, калі адзін метафарызаваны дзеяслоў у працэсе развіцця думкі выклікае дзеясловы з пераносным значэннем: *Цяпер настаўнік у мяне другі – суровы майстар гартавання, **бярэ** ён смела на агні выпрабавання. Да белага **напаліць**. Малатком **настукае**, **направіць** і ў ваду. І зноў іду вясёлым юнаком праз усе жыццёвыя нягоды* [1, с. 16]; *Долу **ўпала** галавою на гасцінец апусцелы. Нахіліўшыся над ёю, клён стаіць асірацелы. Што ж ты, белая бяроза, **не пайшла** з ім да канца і на самай паўдарозе **кінула ўдаўца**?* [2, с. 62].

Аўтар выкарыстоўвае гэты прыём пры характарыстыцы абстрактных паняццяў. У пэўных абставінах прыём ампліфікацыі сінанімічных метафарызаваных дзеясловаў набывае гіпербалічны характар, што дапамагае асэнсаванню аўтарскай задумы і ўздзейнічае на чытача: *Другі **выбіўся** ў чыны, ля турэмнай **стаў** сцяны* [3, с. 233]; *Зло **раскалола** такое ядро, што ўсіх **падзяліла** аднолькава – і праведнікаў і грэшнікаў* [4, с. 10]; *Злосцю нянавісць **не выб'еш**, зямля, як **выбіваюць** клін клінам* [2, с. 13].

У першым прыкладзе дзеяслоўныя метафары перадаюць душэўны боль маці, якая пакутуе ад здрады свайго сына, што «выбіўся ў чыны, і стаў ля турэмнай сцяны». Другі і трэці прыклады пры дапамозе гіпербалізацыі паказваюць адчай, якім ахоплена грамадства: зло «раскалола і падзяліла ўсіх», злосць і нянавісць немагчыма «выбіць, як выбіваюць клін клінам».

Пры стварэнні пейзажных замалёвак, лірычных адступленняў паэт карыстаецца словамі ўсіх лексіка-семантычных груп. Пamastацку характарызуе шматлікія прыродныя з'явы і аб'екты.

*Цішыня: і такой пяшчотай і любоўю **агарнула** ўзлесак цішыня* [2, с. 49]; ***Выходзіць** на экраны цётка Цішыня* [4, с. 17]; ***Запісалі** мы на плёнку цішыню* [4, с. 17]; *Роўна на адну гадзіну **зойдзе** да вас цётка Цішыня* [4, с. 18].

*Цень: **Лёг** на травы доўгі цень, росны і халодны* [5, с. 50].